УДК 001.891.3

Г. Ф. Швед, ст. выкладчык (БГТУ, г. Мінск)

# ДЫПЛОМНАЯ РАБОТА ЯК АДЗІН З ВІДАЎ НАВУКОВАЙ ПРАЦЫ

Выкананне дыпломнай работы ў значнай меры дае магчымасць меркаваць аб падрыхтаванасці выпускніка да далейшай дзейнасці. Асноўнымі мэтамі дыпломнай работы з'яўляюцца: 1) сістэматызацыя, пашырэнне і паглыбленне тэарэтычных ведаў будучага спецыяліста; 2) развіццё навыкаў самастойнай працы, авалоданне методыкай даследвання і эксперыментавання пры рашэнні практычных задач.

Варта мець на ўвазе, што дыпломная работа – гэта не пераказ крыніц літаратуры, а дастаткова самастойная даследчая праца. Яна ўключае ў сябе: а) вылучэнне праблемы, якая не атрымала дастатковага асвятлення ў літаратуры; б) выяўленне і ўвядзенне ў навуковую мову новых крыніц і паведамленне на гэтай аснове новых фактаў; в) устанаўленне новых сувязей паміж вядомымі з'явамі; г) новая пастаноўка вядомай праблемы; д) арыгінальныя вывады; е) рэкамендацыі аб выкарыстанні выяўленых матэрыялаў і вывадаў у навуцы або практыцы.

Працэс падрыхтоўкі і выканання дыпломнай работы ўключае некалькі асноўных этапаў: выбар тэмы, зацвярджэнне яе кафедрай; складанне плана работы; выбар методыкі працы над крыніцамі і літаратурай; складанне каляндарнага плана выканання працы; збор матэрыялу, складанне бібліяграфіі, аналіз і абагульненне сабранага матэрыялу; пісьмовае выкладанне вынікаў даследавання; фармулёўка вывадаў; праверка тэксту навуковым кіраўніком, складанне ім водгуку аб дыпломнай рабоце; унясенне выпраўленняў і ліатаратурная апрацоўка рукапісу; афармленне дыпломнай работы, складанне бібліяграфіі, афармленне вокладкі; рэцэнзаванне дыпломнай работы; падрыхтоўка да абароны: напісанне тэксту выступлення, падбор неабходных матэрыялаў (схем, дыяграм, табліц, ілюстрацый) для дэманстрацыі падчас абароны.

Важным і адказным этапам ў напісанні дыпломнай работы з'яўляецца выбар тэмы.

Пры вызначэнні тэмы ўлічваюць не толькі яе актуальнасць у навуковым і практычным плане, але і наяўнасць крыніц і літаратуры. Акрамя таго, яна павінна даць студэнту магчымасць выявіць сябе як даследчыка.

Тэматыка курсавых і дыпломных работ распрацоўваецца кафедрамі. Канчаткова тэматыку зацвярджае савет факультэта.